# ФЕСТЫВАЛЬ КНІГІ Ў КАРЭЛІЧАХ

29 красавіка ў Карэліцкім раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці адбыўся III Міжрэгіянальны фестываль «PRAсоўванне кнігі. Бібліятэчныя ступені», прысвечаны Году гістарычнай памяці. Пасля ўрачыстага адкрыцця фестывалю свята працягвалася на бібліятэчных пляцоўках. Бібліятэкі рэгіёна паўдзельнічалі ў конкурсе і атрымалі ўзнагароды за лепшыя выставачныя працы ў намінацыях «Кніга ў кадры», «Бібліяграфія з фантазіяй», «Бібліятэкі. ПRAсоўванне».

Падчас фестывалю адбыліся сустрэчы чытачоў з беларускімі пісьменнікамі – Дзмітрыем Юртаевым, Ірынай Карнаухавай, Леанідам Дранько-Майсюком, Віктарам Шніпам, Алай Петрушкевіч, Святланай Кошур.

На працягу фестывалю працаваў «Кніжны кірмаш» – выстаўка-продаж кніг Выдавецкага дома «Звязда». Жыхары і госці Карэліч мелі магчымасць набыць кнігу любімага аўтара і атрымаць аўтографы беларускіх пісьменнікаў, якія завіталі на фестываль.

Ажывіла і ўпрыгожыла свята музыка ў выкананні навучэнцаў Карэліцкай дзіцячай школы мастацтва і Карэліцкага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці.

**Святлана КОШУР**
удзельнік фестывалю



Віктар ШНІП

**На фота:** III Міжрэгіянальны фестываль «PRAсоўванне кнігі. Бібліятэчныя ступені», прысвечаны Году гістарычнай памяці. Карэлічы, 29 красавіка 2022 года.



Дзмітрый ЮРТАЕЎ



Ірына КАРНАУХАВА



Святлана КОШУР




ПОЛЫМЯ
www.polymia.by